конкурентоспособности сектора связано с эффективным функционированием каждого элемента системы. В статье рассматриваются изменения в области производства и переработки молока, эффективность экспорта молочной продукции.

Summary

The main content of the paper is analysis of the present status and changes of dairy sector in Belarus. The point of view on problems is based on complicated system changes. Shi defines of integration structure of dairy sector. The competitiveness of this sector connected with efficiency function of each element of it. The article describes the changes in production and processing of milk, the efficiency of milk products export.

УДК 78

# ГРОДЗЕНСКІ ХОР “БАЦЬКАЎШЧЫНА” І ЯГО РОЛЬ У РАЗВІЦЦІ І ПРАПАГАНДЗЕ БЕЛАРУСКАЙ ДУХОЎНАЙ МУЗЫКІ

**М.І. Таранда, М.В. Амелішка**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У савецкія часы шмат увагі надавалася развіццю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных. Гэта праяўлялася ў тым, што кожнае прадпрыемства мела свой хор, часта танцавальны калектыў ці ансабль песні і танца, які абавязкова праз гады абараняў званне народнага. Прыкладам могуць служыць гродзенскі гарадскі народны ансамбль песні і танца “Нёман”, народны ансамбль танца “Раніца”, які належаў тэкстыльшчыкам і затым пераўтварыўся ў філарманічны калектыў “Белыя Росы”, “Вянок”, які фінансаваўся ГВА “Азот”, “Праліца” абараняла гонар прадзільна-ніткавага камбіната. Рэгулярна праводзіліся агляды самадзейнай творчасці школьнікаў. Такія агляды былі на ўзроўні раёнаў, затым абласцей і нарэшце рэспубліканскія. Аднаму з аўтараў гэтага артыкула пашчасціла стаць Лаўрэатам I, II і IV Усесаюзных аглядаў самадзейнай народнай творчасці працоўных, што падцвярджалася ў кожным выпадку спецыяльнай медалью. Вышэйшай узнагародай для народных калектываў была магчымасць выступаць на ВДНГ СССР, на ўсесаюзных і рэспубліканскіх з’ездах партыі, тады адзінай, і, нарэшце, выехаць на гастролі за мяжу. Прычым такія паездкі размяркоўваліся так, каб ніхто не аказаўся пакрыўджаным, бо ўдзельнікі затрачвалі свой уласны час на шматлікія рэпетыцыі, якія зусім не аплочваліся фінансава. Інстытуцкая самадзейнасць, якая тады

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

існавала, рэдка выбівалася на такія высокія ўзроўні. Агітбрыгада, як яна тады называлася, Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута выступала тады па святах у калгасах раёна і вобласці, пад час уборкі проста на палях у абедзенным перапынку.

У лістападзе 1986 года моладзь з розных абласцей рэспублікі, якая была аб'яднана ў клубы розных накірункаў: гістарычныя, самадзейныя, экалагічныя – сабралася ў мінскім палацы культуры тэкстыльшчыкаў. Пасля нарады вечарам мінчане спрабавалі перадаць іншым свой вопыт калядавання. Яны не толькі спявалі самі, але і заставілі гасцей развучыць адну з калядных песен. У той год мы не змаглі арганізавацца і распачаць калядаванне ў Гродна, але праз год такое калядаванне ўжо адбылося (пачыналі калядаваць з раёна чыгуначнага вакзала, а завяршалі – пад раніцу ў канцы вуліцы Каліноўскага), а яшчэ праз год ужо мелі поўную песенную праграму на святкаванне першага ў навейшай гісторыі горада Купалля. Дапамагла Віялета Ефіменка, якая кіравала нейкім гуртом народнай песні ў Мінску і даслала нам сабраныя імі і запісаныя на магнітафонную стужку купальскія песні. Якраз у тым годзе на гастролях у Гродна быў Львоўскі тэатр імя М.Занькавецкай. Усю ноч на беразе Нёмана ў Румлёўскім парку гучалі беларускія і ўкраінскія купальскія песні. На Купаллі ў 1989 годзе ў якасці гасцей прысутнічалі з дзесятак студэнтаў-беларусаў з Польшчы. Самадзейнасць працягвалася яшчэ некалькі гадоў. Развучваючы новыя песні мы карысталіся дапамогай кампазітара Яўгена Петрашэвіча, выкладчыцы музычнага вучылішча Жаны Ніканові. Самі запісвалі песні ў розных мясцовасцях ад старых людзей і развучвалі іх.

Восенню 1991 года супрацоўніца музея гісторыі рэлігіі і атэізму Вікторыя Палікарпаўна Тарасевіч прапанавала стварыць хор духоўнай музыкі. Ад пачатку станаўлення хрысціянства пачалі складвацца свае, уласцівыя Беларускай Праваслаўнай Царкве, распевы (супрасльскі, віленскі, мірскі і іншыя). Ствараліся таксама і пазалітургічныя спевы як самім народам, так і прафесійнымі кампазітарамі. Музычныя традыцыі былі прадоўжаны ў свой час уніяцкай царквой. Але з забаронай уніі ў 1839 годзе было адкінута ўсё назапашанае царквою з X стагоддзя, у тым ліку і музыка. Забараняліся і пазалітургічныя духоўныя  песні, сабраныя і запісаныя пазней даследчыкамі. На роль кіраўнічкі хору духоўнай музыкі нехта прапанаваў выкладчыцу спеваў музпедвучылішча Веру Васільеўну Кунцэвіч, якая сама любіла спяваць у царкоўным хоры і цікавілася музычнай спадчынай беларускіх кампазітараў – Міколы Равенскага, Міколы Куліковіча-Шчаглова і іншых.

Практычна сярод пачынальнікаў хору аказаліся выкладчыкі фізікі Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута Міхась Амелішка са сваёй жонкай Ліліяй і Юрый Сіткевіч, а таксама былы выпускнік гэтага інстытута Мікола Таранда. Паколькі спевакоў было няшмат, вырашылі звярнуцца за дапамогай да сябраў клуба “Паходня”, якія сапраўды падтрымалі хор. Склад яго павялічыўся да 26 чалавек. З першых песен, якія з’явіліся ў рэпертуары хору былі “Магутны Божа” на словы Наталлі Арсенневай, “Неба і зямля”, “Ой на моры, моры”, “Учора з вячора...”, “Ціхая ноч” і інш. У лютым 1992 года Вера Кунцэвіч пайшла ў дэкрэтны водпуск і хормайстрам стала Святлана Высоцкая, выкладчыца музыкі і спеваў адной з гарадзенскіх школ. З траўня рэпетыцыі, якія ў ГДК перашкаджалі ансамблю песні і танца “Нёман”, былі перанесены ў канцэртную залу ВА “Гроднаэнерга”. Не ўсе пахаднянцы, якія спявалі разам, перабраліся туды. Але калектыў папаўняўся новымі спевакамі. Рэпертуар папоўніўся вялікод-нымі песнямі “Вялік святы”, “Хрыстос уваскрос з мёртвых”. У траўні вярнулася ў хор Вера Кунцэвіч. Юры Сіткевіч быў не толькі фізікам, але яшчэ і лірыкам. Ён пісаў вешы і на адзін з іх “Гучыць наш хор” Яўген Петрашэвіч склаў музыку да 10-х угодкаў хору “Бацькаўшчына”, якая выконваецца на канцэртах калектыву.



*Удзельнікі хору, былыя выкладчыкі фізікі ГСХІ ў Капенгагене М.Амелішка і Ю.Сіткеві/ч у 1996 г.*

У кастрычніку 1992 года хор “Бацькаўшчына” пачаў спяваць у Фарным касцёле і суправаджаць імшу на беларускай мове, якая пачынаецца кожную нядзелю а 15-й гадзіне, а ўжо ў ліпені таго ж году хор прыняў удзел у фестывалі “Магутны Божа”, які праводзіўся ў Магілёве. Паколькі выступілі ўдала, былі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

прэміраваны Дыпломам у намінацыі “За выкананне твораў выключна на беларускай мове”. У верасні 1993 года ўдзельнікі хору пабывалі на сустрэчы з Папам Рымскім Янам Паўлам II у Вільні. Канцэрты працягваліся. У траўні 1994 года наведалі Жыровічы, пад час святкавання абраза Божай Маці Жыровіцкай. Спявалі ля алтара да таго часу, пакуль не выканалі песню “Дай, добры Божа, зару і сонца бачыць...”, якая аказалася уніяцкай. Хор папрасілі спыніць спевы. Новы прабашч Фарнага касцёлу ў Гродна таксама адмовіўся ад супраджэння хорам службаў. Восенню 1994 года пачалася праца над новымі творамі духоўнай музыкі, якія даслаў з Лонданскай Скарынаўскай бібліятэкі англічанін-беларусіст Гай Пікарда. У тым жа годзе стала вядома, што творчасцю хора зацікавіўся пастар адной з Лютэранскіх цэркваў Колдзінга, горада ў Даніі. Але ён прасіў каб у рэпертуары хору былі акрамя духоўных песен яшчэ і фальклорныя. У чэрвені 1995 года хор “Бацькаўшчына” прыняла ўдзел у святкаванні 500-годдзя Мірскага замка. Акрамя іншых песен у канцэртнай праграме хору была песня Яўгена Петрашэвіча “Замак Мірскі – волі калыска”. 15 ліпеня хор спяваў патрыятычныя і духоўныя песні на адкрыцці помніка Вітаўту на пляцоўцы паміж Старым і Новым замкамі, а 2 лістапада – на адкрыцці памятнай дошкі ў гонар паўстанцаў Каліноўскага на будынку чыгуначнага вакзала. У жніўні 1996 года хор у складзе 39 чалавек наведаў Данію, дзе выступіў з шэрагам канцэртаў, а ў ліпені наступнага года моладзевая частка хору ўдзельнічала ў фестывалі міжнароднай аркестрады ў Францыі, дзе кожны дзень выступала на двух-трох сцэнічных пляцоўках. Па дарозе назад далі некалькі канцэртаў у розных храмах Германіі.

Некалькі разоў сябры з Даніі прывозілі ў Гродна матэрыяльную дапамогу, у тым ліку каляскі для інвалідаў. А хор неаднаразова выступае не толькі амаль ва ўсіх храмах Гродна, але і ў санаторыі Парэчча, у Лідзе і Свіслачы, Навагрудку і Слоніме, Полацку і Віцебску. У 2001 годзе адбыліся паездкі хору з канцэртамі ў Польшчу, другі раз у Данію, на Міжнародны фестываль грэка-католікаў у Крылас, што на Украіне, дзе нібыта з’явілася людзям Маці Божая.

10 студзеня 2002 года хор адзначыў сваё 10-годдзе. Да гэтай даты хор за сваю гісторыю даў больш за 200 канцэртаў. Юбілейная вечарына адбылася ў ГДК, павітаць юбіляраў прыйшлі мастацкія калектывы – “Гасцінец”, “Нёман”, польскі хор “Глос з над Немна”, выканаўцы песен пад гітару, паэты. Пасля юбілею былі канцэрты ў касцёлах Літвы, Польшчы, у Будславе, на фестывалі ў Чарнаўцах, у саборы Полацкай Сафіі, у храмах Познані, Обры, Вроцлава, нарэшце Бучача, што ў Цярнопальскай вобласці. Накануне сваіх 15-х угодкаў



РЕПОЗИТОРИЙ ГрГАУ

хор выступіў перад ветэранамі ГДАУ, а сама юбілейная вечарына адбылася ў Гродзенскай Лютэранскай Кірхе, ад якой было адключана святло. Спадзяваліся, што урачыстасць будзе асвятляцца звычайнымі свечкамі. Але ў той вечар у храм, дзякуючы харысту "Бацькаўшчыны" Кастусю Жыню, які працуе ў "Гроднаэнерга", было дадзена святло. І вечар быў цудоўны, дзякуючы кіраўніку хора Веры Кунцэвіч, якая свае невычэрпныя сілы аддае свайму калектыву, арганізацыі святаў, якія адбываюцца ў Гродна. І што цікавае, у чарговым юбілейным канцэрце прынімаў удзел студзент 4-га курса аграфака ГДАУ.



*Удзельнікі хора "Бацькаўшчына" разам з беларускім спеваком са ЗША Данчыкам на сцэне Дома афіцэраў у снежні 1996 г.*

Дзякуючы аднаму толькі хору, сабрана багатая духоўная песенная спадчына беларускага народу, якая ўжо не зможа быць страчана ніколі. Колькі гадоў назад ніхто і не падазраваў, як шмат захавалася яшчэ кананічных песен, як і старажытнай беларускай музыкі. У гэтым годзе гарадзенцы ўпершыню пазнаёміліся з унікальнымі музычнымі калектывамі Беларусі – "Троіца", "Стары Ольса", "Палац", якія таксама займаюцца збіраннем і развіццём непаўторнай духоўнай спадчыны свайго народу.

Літаратура

М. Амелішка. Гучыць хор "Бацькаўшчына". – Гродна, 2007.– 68 с.

Рэзюме



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Хору духовной музыки “Бацькаўшчына” в 2007 году исполнилось 15 лет. В статье представлены основные этапы его становления и вклад в развитие белорусской культуры.

Summary

To chorus of sacred music “Batskauschyna” in 2007 15 years were executed. In article the basic stages of his becoming and the contribution to development of the Byelorussian culture are submitted.

УДК 502.12 (476.6)

## ЭКАЛАГІЧНЫ РУХ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ Ў КАНЦЫ XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

**М.І. Таранда**

УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт”

г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Толькі год таму ГДАУ адзначыў свае 55 угодкі. Яго выпускнікі, спецыялісты, непасрэдна звязаныя з працай у сельскай гаспадарцы, як ніхто іншы аказвалі ўплыў на экалагічны стан нашай рэспублікі ў другой палове XX стагоддзя. Асвойваліся новыя тэрыторыі, асушваліся забалочаныя прасторы, зямная паверхня і воды забруджваліся адыходамі калійнай вытворчасці ў Салігорску. Так званыя “лісіныя хвасты” яшчэ ў 80-тыя годы упрыгожвалі трубы ГВА “Азот”. Чарговы праліў нафты з нафтаправаду ў Бешанковіцкім раёне ў сакавіку 2007 года прывёў да забруджання басейну Дзвіны.

Вядома, што кадры для сельскай гаспадаркі Беларусі ў міжваенным перыядзе рыхтаваліся на аграрным факультэце Віленскага універсітэта. Узначальваў сельскагаспадарчы факультэт Станіслаў Пачобут-Адляніцкі, які паходзіў з Гродзеншчыны. Сярод студэнтаў былі Бернанд Стэповіч, Ганна Сухая і іншыя. Пасля вайны сельскагаспадарчы факультэт Віленскага універсітэту пераехаў у Познань. З цягам часу С. Пачобут-Адляніцкі стаў дырэктарам станцыі ільна, якая пазней пераўтварылася ў Інстытут натуральнага валакна. Між іншым Б. Стэповіч пісаў дыпломную працу таксама па ільну, а ў сям’і захаваўся альбом са студэнцкіх практык. Тэмамі для дыпломных былі надоі кароў, папуляцыі зайцоў у Налібокскай пушчы і іншыя.

У 1986 годзе аўтар працаваў у Інстытуце біяхіміі АН Беларусі ў Гродна. Не ведаючы ў які́м баку той Чарнобыль, пасля аварыі было заўважана , што запрацавалі нават тыя прыборы, у якіх заўсёды загаралася толькі зялёнае святло, якое паказвала, што пасля працы з радыяктыўнымі ізатопамі рукі даследчыка чыстыя ад радыяцыі. У той



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ